кі, І.Аляшкевіча. У 1785 у Мараўскіх гасцяваў кароль польскі і вял. кн. літоўскі Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, у 1818 — рас. імператар Аляксандр І. Пасля Мараўскіх сядзіба перастала іграць ролю магнацкай рэзідэнцыі. Яе ўладальнікамі былі С.Радзівіл, а затым яе дачка М.Гагенлоэ. Відавочнае ажыўленне свецкага жыцця настала пры Гарцінгах, якія часткова перапланавалі дом, заклалі пейзажны парк, пабудавалі новыя службовыя і гасп. памяшканні. У доме была мэбля ў стылі Людовіка XVI, збор жывапісу (напр., ікона Маці Божай з немаўлём і Іаанам Хрысціцелем, якая адносіцца да школы П.Рубенса), невял. б-ка, вырабы з бронзы, сталовае серабро. Усе зборы былі разрабаваны ў 1914—18 (быў створаны кінатэатр). Ад сядзібы захаваліся фрагменты паркавых насаджэнняў і напаўразбураныя будынкі: капліца Мараўскіх з порцікам з 6 калон, свірны з бруса, сыраварня, млын, ядоўня, архаічнае нізкае збудаванне, складзенае з бутавага каменю, пад 4-схільным дахам. *А.Т.Федарук.*

**ЗАВЯ́ЗКА**, эпізод у пачатку твора, у якім адбываецца сутыкненне супрацьлеглых пазіцый герояў. У многім вызначае развіццё дзеяння і канфлікт, бывае выразна абазначана. Так, З. у паэме «Бандароўна» Я.Купалы з'яўляецца першая сустрэча гераіні з панам Патоцкім у карчме, што перарасла пазней у смяротнае супрацьстаянне. Гэты твор — прыклад і таго, што З. прадказана экспазіцыяй (1-ы раздзел). У інш. творах З. менш прыкметная, яна завуалявана працэсамі, што адбываюцца ў душы герояў (аповесці М.Гарэцкага). У вял. эпічных палотнах, дзе распрацоўваецца некалькі сюжэтных ліній, узнікае некалькі З. У лірычных творах, дзе сюжэт — гэта рух пачуцця, З. малапрыкметная, яна траціць сваю першасную функцыю — супрацьстаянне. *А.М.Петрушкевіч.*

**ЗАГА́ДКА**, старажытны малы жанр фальклору. У аснове стварэння З. ляжыць практыка пераносу прыкмет з аднаго прадмета на другі. У З. канкрэтныя прадметы ці з'явы выступаюць як знакі інш. прадметаў ці з'яў, сімвалічна іх замяняюць: «Стаіць дуб, на дубе — канапліна, на канапліне — гліна, на гліне — гарох, а ў гаросе — свінні» (Дубовы стол, міса з гарохам і скваркамі). У стараж. часы З. заключалі патаемную мову, з дапамогай якой людзі пазнавалі ўладкаванне Сусвету, яго формы і прынцыпы арганізацыі. Доўгі час магічныя звароты З. выкарыстоўваліся ў разнастайных жыццёвых сітуацыях, перамовах, у гандлёвых справах і інш. З цягам часу ў З. атрымалі развіццё свядомыя этычныя адносіны чалавека да рэчаіснасці, а звычайныя прадметы сталі не толькі сімвалізаваць інш., але і абагульняцца ў маст. вобраз: «З акна ў акно залатое верацяно» (Прамень сонца). З. знайшлі адлюстраванне ў казках, дзе герой, праяўляючы мудрасць і кемлівасць, дасягаў сваёй мэты. Яны загадваліся на вячорках восенню і зімой, у час гульняў моладзі. Людзі старэйшага ўзросту З. выпрабоўвалі інтэлект і веды моладзі, давалі дзецям урокі жыццёвага вопыту, ведання навакольнага свету. У З. адбіліся сляды розных гіст. эпох развіцця грамадства, яны жыва адгукаліся на вострыя праблемы сац. і культ. жыцця, а ў перыяд класавай барацьбы і сац. рэвалюцый набывалі рысы сатыры. У аснову класіфікацыі З. пакладзены гіст.-тэматычны прынцып, у адпаведнасці з якім яны падзяляюцца на раздзелы: прырода і чалавек, гаспадарка і матэрыяльны быт, грамадскі і сямейны быт, культура. У З. у маст. форме ўвасобіліся эмпірычныя веды чалавека аб прыродзе, космасе, яго жыццёвы і працоўны вопыт, мудрасць, тонкая назіральнасць, здольнасць да асацыятыўнага мыслення, невычарпальная фантазія і інш.: «Раўнуў вол на сто гор, на тысячу азёр» (Гром). Пры пабудове З. выкарыстоўваюцца метанімія, перыфраза, сінекдаха, метафара: «Чырвонае карамысла праз рэчку павісла» (Вясёлка). У сферу маст.-асэнсавання З. трапляе ўсё, што заўважае, чуе, адчувае таленавіты чалавек — творца.

*Літ.:* Гілевіч Н.С. Паэтыка беларускіх загадак. Мінск, 1976; Гурскі А.І. Беларускія загадкі: даслед. жанру. Мінск, 2000. *А.М.Аляхновіч.*

**ЗАГАЛО́ЎНАЯ ЛІ́ТАРА**, ініцыял, вялікая літара, літара больш буйнога памеру і асаблівага напісання. З.л. выконваюць 2 асн. функцыі: сінтаксічную (служыць для выдзялення межаў тэксту, пачатку сказа і інш.) і сэнсавую (адрозніваюць уласныя і агульныя імёны). Выкарыстанне З.л. рэгламентуецца арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі правіламі. З вял. літары пішуцца: першае слова ў сказе, першае слова пасля клічніка, якім выдзяляецца зваротак, а таксама выклічнік у пачатку сказа. Па традыцыі з З.л. пачынаецца кожны новы радок у вершаваных тэкстах. З.л. выкарыстоўваецца ў імёнах, імёнах па бацьку, прозвішчах, псеўданімах, мянушках [Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч (Якуб Колас), Марыя-Луіза-Жазэфіна, Нестар Летапісец], найменнях найвышэйшых божастваў у рэліг. культах (Бог, Алах, Прасвятая Тройца), імёнах легендарных і міфічных асоб, язычніцкіх багоў (Антэй, Пярун, Цмок), агульных назвах істот, калі яны выступаюць у ролі імён герояў літ. твораў (Мядзведзь, Бусел-клекатун, Крыўда), уласных назвах геагр. аб'ектаў (Арарат, Мазыр, Андрамеда), найменнях вышэйшых органаў заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады Рэспублікі Беларусь і інш. краін (Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь), афіц. назвах асобы на вышэйшых дзярж. і рэліг. пасадах (Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі) і інш. *Д.В.Дзятко.*

**ЗАГАРУ́ЛЬСКІ** Эдуард Міхайлавіч (н. 18.12.1928, г. Тула, Расія), беларускі археолаг, гісторык. Д-р гіст. навук (1984), праф. (1986). Засл. ра-